Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 29 (307) | Пятніца, 13 снежня 1957 года | Цана 20 кап.

УЗНЯЦЬ УЗРОВЕНЬ ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ

На справаздачна-выбарчым сходзе комуністы зрабілі многа крытычных заўваг у адрас парткома і выказалі рад канкрэтных прапаноў, накіраваных на палепшанне партыйнай работы ва універсітэце. Партком, партбюро факультэтаў, адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, выдавецтва, спецкафедры павінны ўлічыць крытычныя заўвагі і рэалізаваць прапановы комуністаў у сваёй практычнай рабоце.

Галоўным у рабоце партарганізацый універсітэта з'яўляецца забеспячэнне падрыхтоўкі высокакваліфікаваных, усебакова развітых, адданых сваёй сацыялістычнай Радзіме спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі і культуры. Ажыццяўленне гэтай задачы патрабуе ад партыйнай арганізацыі штодзённай творчай работы. Партком, партбюро пярвічных арганізацый павінны дабівацца палепшання вучэбнай і навуковай работы. У гэтых мэтах неабходна сістэматычна дапамагаць рэктарату і дэканатам у іх рабоце па арганізацыі вучэбнага працэсу, кафедрам і асобным выкладчыкам, асабліва пачынаючым сваю выкладчыцкую дзейнасць,—павышаць як метадалагічны, так і метадычны ўзровень лекцыйных і практычных заняткаў, а таксама навуковай работы.

Неабходна перыядычна заслухоўваць на сваіх пасяджаннях дэканаты і кафедры, прычым не толькі тыя, якія слаба працуюць, але і тыя, якія добра працуюць, вывучаць іх вопыт і перадаваць другім.

Якасць вучэбнай і навуковай работы у многім залежыць ад матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння вучэбнага працэсу. Таму партарганізацыя адміністрацыйна-гаспадарчай часткі павінна накіраваць сваю ўвагу на тое, каб студэнты і прафесарска-выкладчыцкі склад маглі працаваць у своечасова і якасна адрамантаваных і добра абсталяваных аўдыторыях і кабінетах. Неабходна праяўляць больш клопатаў аб жыллёва-бытавых умовах навуковых работнікаў, рабочых і служачых універсітэта. У партком прыходзяць многія комуністы, якія скардзяцца на тое, што іх шматлікія просьбы у адміністрацыйна-гаспадарчую частку застаюцца без увагі.

У цэнтры ўвагі партыйнай работы павінны быць пытанні ідэалагічнага выхавання студэнтаў, а таксама выкладчыкаў, рабочых і служачых універсітэта. Пры партконе працуе 9 семінараў навуковых работнікаў, 3 семінары лабаранцкага складу і 4 гуртки рабочых і служачых. Важнейшай формай ідэалагічнага выхавання студэнтаў з'яўляюцца лекцыі і практычныя заняткі, якія праводзяцца на факультэтах. Гэтую форму неабходна дапоўніць другімі формамі. Найбольш эфектыўнымі з іх з'яўляюцца палітычныя інфармацыі і гутаркі у групах, выступленні перад студэнтамі на палітычныя тэмы кіраўнікоў універсітэта, факультэтаў, загадчыкаў кафедрамі, прафесараў, дацэнтаў, правядзенне мітынгаў і сходаў, прысвечаных важнейшым палітычным падзеям, арганізацыя сустрэч з перадавікамі прадпрыемстваў, старымі большэвікамі, відавымі пісьменнікамі, правядзенне студэнцкіх вечароў, работа студэнтаў у грамадскіх арганізацыях і добраахвотных таварыствах, развіццё шэфскіх сувязей з прамысловымі прадпрыемствамі, калгасамі, часцямі і злучэннямі Совецкай Арміі і Флота і г. д.

Аднак усё гэтае багацце форм ідэалагічнай работы выкарыстоўваецца у нас далёка не поўна. На многіх факультэтах (хімічным, біялагічным, філалагічным), для работы у групах выдзелены пераважна маладыя выкладчыкі, мала комуністаў. Партбюро не ажыццяўляюць належнага кіраўніцтва работай групавых арганізатараў, не вывучаюць іх вопыту. Вельмі рэдка выступаюць перад студэнтамі з палітычнымі дакладамі дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедрамі. На палітычныя мітынгі, правадзімыя на факультэтах, прыходзяць далёка не усе выкладчыкі. Так, напрыклад, на мітынгу гістфака і юрфака, прысвечанаму вынікам Маскоўскіх Нарад прадстаўнікоў комуністычных і рабочых партый прысутнічалі дэкан гістфака П. З. Савачкін, сакратары партбюро факультэтаў С. Г. Скапцоў і І. А. Юхо, выкладчыкі тт. Грышановіч, Рагожын, Левін, Шнеерсон, Мельцэр, Рудзіцкі. Абсалютная-ж большасць выкладчыкаў у гэтым мерапрыемстве не прыняла удзелу. Вельмі мала выкладчыкаў бывае у інтэрнатах, на студэнцкіх вечарах, якія праходзяць у нас на нізкім арганізацыйным узроўні.

Прыкметна зніжэнне узроўню работы самадзейпасці. Нашы калектывы самадзейнасці цяпер выступаюць ніжэй сваіх магчымасцей. Заняткі гурткоў з прычыны недысцыплінаванасці асобных членаў праходзяць не рэгулярна.

У сваёй рабоце партарганізацыя, калі яна жадае дабіцца поспеху, павінна абапірацца на работу комсамольскай, профсаюзнай арганізацый, добраахвотных таварыстваў. А гэта азначае, што трэба навысіць узровень кіраўніцтва гэтымі арганізацыямі з боку парткома і партбюро факультэтаў. Неабходна клапатліва вырошчваць комсамольска-профсаюзны актыў, вучыць яго формам і метадам комсамольска-профсаюзнай работы, дапамагаць комсамольскім і профсаюзным органам у іх рабоце па палітычнаму і культурнаму выхаванню сваіх членаў. Неабходна у мэтах аказання дапамогі комсамольскім групам пасылаць туды найбольш вопытных комуністаў, якія дапамаглі-б рыхтаваць комсамольскія сходы і другія мерапрыемствы.

Ад парткома патрабуецца павысіць узровень арганізацыйнага кіраўніцтва пярвічнымі партарганізацыямі. Членам парткома трэба часцей бываць у арганізацыях, дапамагаць партбюро у іх практычнай рабоце. Ва ўздыме узроўню партработы вялікае значэнне маюць семінары сакратароў, членаў партбюро па абмену вопытам работы. Цэнтр арганізацыйнай і партыйна-палітычнай работы трэба перанесці на факультэты, бліжэй да мас. Гэта дазволіць парткому працаваць больш аператыўна. Партыйнаму камітэту трэба больш і лепш кантраляваць выкананне сваіх рашэнняў і вучыць гэтаму партбюро і кіруючыя органы комсамольскай і профсаюзнай арганізацый.

Прайшоўшы час пасля справаздачных сходаў паказаў, што яшчэ не усе партарганізацыі перабудавалі сваю работу. У партарганізацыях юрыдычнага і філалагічнага факультэтаў у лістападзе многія комуністы не заплацілі партузносы. У партарганізацыі гістфака на працягу двух месяцаў не праводзіліся партсходы. У радзе арганізацый працягваецца ранейшы стыль кіраўніцтва грамадскімі арганізацыямі. Усё гэта гаворыць, што перыяд перабудовы вельмі зацягнуўся. Ці не час канчаць перабудоўвацца? Пара паналежнаму узяцца за справу!

І. М. ІГНАЦЕНКА,
сакратар парткома БДУ.

ЗМЯСТОЎНА, КАРЫСНА, ЦІКАВА!

На усіх факультэтах пачалося чытанне лекцый па матэрыялах юбілейнай сесіі Вярхоўнага Совета СССР. Дацэнт В. І. Мацко прачытаў лекцыю для студэнтаў 1, 2, 3 курсаў філфака па першаму раздзелу даклада тав. Н. С. Хрушчова «Галоўныя вынікі развіцця нашай краіны за 40 год.»

На канкрэтных прыкладах з гісторыі совецкага грамадства лектар паказаў станаўленне і рост Совецкай улады, расказаў аб перамогах і цяжкасцях будаўніцтва соцыялізма.

— Зарубежныя ідэолагі,—гаворыць тав. Мацко,—спадзяваліся, што Совецкая улада не пратрымаецца і двух тыдняў. Аднак жыццё жорстка пасмяялася з іх. Совецкая улада існуе ужо 40 год.

Слухаючы лекцыю, мы, студэнты, былі ахоплены гордасцю за нашу любімую Радзіму.

Е. ПРАКОП'ЕЎ.

ДА СЕСІІ *ЗАСТАЛОСЯ* 35 ДЗЁН!

* * *

ФОТАРЭПАРТАЖ

ГАРАЧЫЯ ДНІ

З кожным днём становіцца цясней у бібліятэцы, чытальнай зале, кабінетах. Адчуваецца набліжэнне экзаменаў. Яшчэ два тыдні назад у кабінеце палітэканоміі цяжка было сустрэць каго-небудзь, акрамя лабаранта. Цяпер-жа з рання да вечара тут заняты амаль усе месцы. Студэнты рыхтуюцца да семінарскіх заняткаў, канспектуюць неабходную літаратуру.

Нярэдка ля стала лабаранта выстрайваецца чарга за кніжкамі. На першым здымку вы бачыце студэнтаў фізіка-матэматычнага факультэта Любу Прышчэп, Уладзіміра Скацецкага і Рэніса Ліснеускага, якія стварылі «жывую чаргу» за літаратурай.

Бываюць выпадкі, калі кніжкі, якую патрабуе хто-небудзь, ужо няма. Нічога не зробіш: спазніўся—адыходзь ад стала з пустымі рукамі. Сёння у становішча спазнішагася трапіў студэнт II курса біяфака Нікалай Белабародаў. На яго долю не засталося ніводнага тома Леніна з творам «Дзіцячая хвароба «левізны» у комунізме».

Няўмольнае набліжэнне сесіі пачынае не на жарт трывожыць студэнтаў філфака. Ды і як тут не турбавацца, напрыклад, трэцекурснікам аддзялення журналістыкі, калі толькі пералічэнне тэкстаў, якія трэба ведаць па рускай літаратуры, заняло дзве гадзіны з «хвосцікам»? Трэба здаваць яшчэ і зарубежную літаратуру. Проста не ведаеш, за што ўхапіцца: прачытаеш зарубежных пісьменнікаў—не паспееш пазнаёміцца з рускімі. Ды і астатнія экзамены патрабуюць шмат часу для падрыхтоўкі. Але многія студэнты знайшлі выхад. Яны адначасова слухаюць лектара, запісваюць яго словы і чытаюць мастацкую літаратуру (здымак 2). Такая карціна на філфаку—не рэдкасць. Відаць, дэканату трэба разабрацца у прычынах, якія парадзілі у студэнтаў схільнасць да цэзараўскіх метадаў працы.

А у хімікаў—свае клопаты. З асаблівай стараннасцю выконваюць яны лабараторныя работы. Паглядзіце, як уважліва праводзіць хімічны аналіз невядомага раствору студэнт II курса Аркадзі Пярцоўскі (здым. 3). І гэта зразумела, бо усе лабараторныя работы па аналітычнай хіміі увойдуць у экзаменацыйныя білеты. У тойжа час яго аднакурсніца Нэля Жучкова адказвае кірауніку заняткамі Людміле Ільінічне Севасцьянавай на пытанні па якаснаму аналізу. Праз некалькі мінут яна атрымае заданне і таксама будзе вызначаць хімічны склад невядомага раствору (здым. 4).

На усіх факультэтах ідзе напружаная, гарачая работа. Універсітэт рыхтуецца да зімовай сесіі.



О. СЦЕПАНЕНКА.

На практычных занятках у першакурснікаў

Мы наведалі студэнтаў I групы I-га курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры філфака, каб пазнаёміцца, як тут праходзіць семінар па гісторыі КПСС.

...Званок. Усе садзяцца. Амаль перад кожным твор В. І. Леніна «Што рабіць?» і свой канспект гэтай працы. Кіраўнік семінара т. Селіванчык пытае, хто будзе адказваць па першаму пытанню. Жадаючых многа.

Аб гістарычных умовах паяўлення кнігі В. І. Леніна грунтоўна адказвае Кулішэўская, аб барацьбе Леніна супроць «эканамістаў»—Клімовіч. Адказ студэнткі Задора, якая поўнасцю яе здолела асвяціць пытанне аб трох формах класавай барацьбы, дапаўняюць Каленчыц і Каваль. Асабліва змястоўным і поўным быў адказ студэнткі Гардзейка аб стыхійнасці ў рабочым руху.

Выявілася, што некаторыя студэнты яшчэ слаба рыхтуюцца да семінара або амаль не рыхтуюцца. Непадрыхтаванымі прыйшлі на заняткі Вітушко і Давідовіч.

Аднак у цэлым першакурснікі сур'ёзна працуюць над творамі класікаў марксізма-ленінізма. Ім яшчэ у значнай меры не хапае толькі вопыту; вялікае-ж жаданне да працы ёсць.

Фёдар ХАРЛАПАЎ.

* * *

ПА ШЛЯХУ СЛУЖЭННЯ НАВУЦЫ

(ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ І 55-ГОДДЗЯ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ).

Владзімір Нікалаевіч ПЕРЦАЎ

Грамадскасць Совецкай Беларусі адзначае 80-годдзе з дня нараджэння і 55-годдзе навукова-педагагічнай дзейнасці выдатных вучоных-гісторыкаў, арганізатараў нашага універсітэта—сапраўднага члена і члена Прэзідыума Акадэміі навук БССР прафесара Владзіміра Нікалаевіча Перцава і доктара гістарычных навук сапраўднага члена АН БССР прафесара Нікалая Міхайлавіча Нікольскага.

* * *

У 1897 годзе В. Н. Перцаў паступіў у Маскоўскі універсітэт на гісторыка-філалагічнь факультэт. У тыя гады на гэтым факультэце працавалі вядомыя вучоныя-гісторыкі прафесары Віппер, Вінаградаў, Карэлін і др. Пад іх навуковым кіраўніцтвам В. Н. Перцаў пачынае сваю плённую працу гісторыка-даследчыка. Захоплены хвалямі рэвалюцыйнай барацьбы з самадзяржаўем, В. Н. Перцаў разам з лепшымі прадстаўнікамі рускага студэнцтва прымае ў ёй актыўны ўдзел. За удзел у рэвалюцыйным руху В. Н. Перцаў двойчы—у 1899 і 1901 гадах—выключаецца з універсітэта і падвяргаецца праследаванням паліцыі і жандармерыі.

Страціўшы надзею закончыць універсітэцкі курс ва ўмовах разгула царскай рэакцыі, В. Н. Перцаў, каб працягваць адукацыю, вымушаны быў выехаць за граніцу. Ён слухае лекцыі ва універсітэтах Вены і Берліна. Аднак недахоп сродкаў прымусіў В. Н. Перцава вярнуцца у Расію. З вялікімі цяжкасцямі яму зноў удаецца паступіць у Маскоўскі універсітэт.

У гэтыя гады В. Н. Перцаў не абмяжоўваецца навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасцю. Ён чытае папулярныя лекцыі рабочым Замаскварэчча.

З 1903 па 1917 гады В. Н. Перцаў напісаў да 30 вялікіх прац на гістарычныя тэмы. Буйнейшымі працамі гэтага перыяду з'яўляюцца «Очерки новой истории XIV—XVI веков», «История Рима», «Учебник древней истории» (часть 1), «Учебник древней истории» (часть 2).

Плеханаў аб рабоце Перцава «Немецкое массонство в 18 веке» у трэцяй кнізе «Истории русской общественной мысли» у раздзеле II піша: «У Германіі, якая далека адставала тады ад Францыі на шляху грамадскага развіцця, дух містыцызму сустракаў менш рашучы адпор з боку перадавых мысліцеляў і таму распаўсюджваўся мацней. Як гаворыць В. Н. Перцаў, містыцызм станавіўся там свайго роду грамадскай заразай, якой не заўсёды пазбягалі нават людзі, меўшыя звычку да цвярозага мыслення».

І далей: «Таму нельга абвінаваціць В. Н. Перцава ў пераўвялічэнні, калі ён гаворыць, што ход развіцця нямецкага масонства дае нам самыя яркія старонкі з гісторыі нямецкага акульцызма, чарадзейства, а часам і простага шарлатанства».

Пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі перад В. Н. Перцавым, як і перад усімі вучонымі нашай краіны, адкрылася магчымасць поўнага развіцця творчых сіл.

У 1918 годзе В. Н. Перцаў выбіраецца прафесарам Смаленскага дзяржаўнага універсітэта і Маскоўскага педагагічнага інстытута. З 1921 года выкладае у розных ВНУ Беларусі—у Мінску, Віцебску, Магілёве, Рагачове.

У цэнтры навуковых інтарэсаў прафесара В. Н. Перцава як і раней знаходзіцца вывучэнне гісторыі народнай гаспадаркі, праблем гісторыі філасофіі, гісторыі Германіі і г. д.

У 1935 годзе В .Н. Перцаву прысуджана вучоная ступень доктара гістарычных навук. У 1949 годзе яго выбіраюць сапраўдным членам АН БССР.

Навуковыя работы, напісаныя акадэмікам Перцавым у апошнія гады, прысвечаны яркім старонкам гісторыі беларускага народа.

В. Н. Перцаў у якасці аднаго з рэдактараў і аўтара прымае актыўны удзел у рэдагаванні выдаваемых Інстытутам гісторыі АН БССР кніг: «Гісторыя БССР», «Нарысы па гісторыі СССР», «Нарысы па гістарычнай навуцы», «Гісторыя філасофіі СССР». В. Н. Перцаў з 1947 года па сучасны момант з'яўляецца дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР.

За плённую, шматгадовую навуковую і педагагічную дзейнасць Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР узнагародзіў В. Н. Перцава 3 ордэнамі Леніна. Прэзідыум Вярхоўнага Совета БССР прысвоіў яму ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі БССР.

Нікалай Міхайлавіч НІКОЛЬСКІ

Нікалай Міхайлавіч Нікольскі, вядомы совецкі ўсходазнавец і гісторык рэлігіі, нарадзіўся 13 лістапада 1877 года у Маскве. У 1896 годзе паступіў у Маскоўскі універсітэт на гісторыка-філалагічны факультэт, дзе займаўся пераважна пад кіраўніцтвам прафесара П. І. Вінаградава і прыват-дацэнта М. В. Нікольскага, свайго баць кі.

Ужо ва універсітэце Н. М. Нікольскі спецыялізуецца ў галіне старажытнай гісторыі асабліва па гісторыі Усходу. Шмат працы ён аддае работе над клінапіссю і семіцкай мовай. Пасля заканчэння універсітэта Нікалая Міхайлавіча пакідаюць пры універсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання, але цяжкае матэрыяльнае становішча не дало яму магчымасці прайсці вялікую праграму для здачы магістарскага экзамену.

У 1901 годзе выходзіць першая праца Н. М. Нікольскага яго дыпломная праца «Иудея при Маккавеях и Асмонеях». У гэтыя-ж гады паяўляюцца кнігі «Древний Израиль», «Древний Вавилон», «Былое вокруг нас», главы па гісторыі рэлігіі і царквы ў «Русской истории» М. Н. Пакроўскага і інш.

У час рэволюцыі 1905—1907 гг. пад уплывам знаёмства з творамі Маркса И. М. Нікольскі прымыкае да большэвікоў і працуе ў лектарскай групе Маскоўскага Камітэта РСДРП пад псеўданімам «З. Антонаў», супрацоўнічае ў большэвіцкіх газетах «Борьба» і «Светоч».

З 1918 года Н. М. Нікольскі—прафесар уноў арганізаванага Смаленскага дзяржаўнага універсітэта.



У 1922 годзе Нікалай Міхайлавіч пераязджае на работу ў БДУ прафесарам старажытнай гісторыі. Тут, акрамя навуковай, вядзе вялікую арганізацыйную работу. У Мінску Н. М. Нікольскі ўпершыню атрымаў магчымасць шырока і поўна разгарнуць навукова-даследчую працу. Актыўна ўдзельнічае у дыскусіі вакол праблемы фармацыйнага тыпу старажытнаусходніх грамадстваў і знаходзіць правільнае рашэнне, якое потым лягло ў аснову рада артыкулаў у «Вестнике древнейшей истории» і манаграфіі па гісторыі аграрных адносін у Двурэччы і грамадска-земляробчай рэлігіі Фінікіі. Ён складае першы падручнік старажытнай гісторыі для сярэдняй школы і раздзел «Усход» для другога падручніка, якім карыстаюцца да гэтага часу.

У гэтыя-ж гады Н. М. Нікольскі працягваў работу ў галіне беларускай этнаграфіі і фальклору.

Нікалай Міхайлавіч мае звыш пяцісот публікацый па пытанях гісторыі Усходу, гісторыі рэлігіі, этнаграфіі.

У 1931 годзе Н. М. Нікольскі абіраецца сапраўдным членам АН БССР, а ў 1944 годзе яму прысвайваецца званне заслужанага дзеяча навукі БССР. З 1946 года Нікалай Міхайлавіч—член-карэспандэнт АН СССР.

Н. М. Нікольскі карыстаецца заслужанай павагай і даверам беларускага народа, які ройчы выбірае яго сваім дэпутатам у Вярхоўны Совет СССР.

За плённую навуковую, педагагічную і грамадскую дзейнасць Н. М. Нікольскі ўзнагароджан 2 ордэнамі Леніна і ордэнам Працоўнага Чырвонага сцягу.

* * *

Адзначаючы заслугі акадэмікаў В. Н. Перцава і Н. М. Нікольскага, пажадаем ім здароўя, бадзёрасці і энергіі для далейшай плённай навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці.

ЧАС НЕ ЧАКАЕ!

Насценны друк мае выключна вялікае значэнне у выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў. Ён дапамагае давесці да шырокіх студэнцкіх мас усё каштоунае, карыснае, што неабходна нашай моладзі. Як і увесь друк, насценныя газеты інтэрнатаў павінны крочыць разам з нашым жыццём, адлюстроўваць выдатныя і адмоўныя з'явы, выяўляць памылкі, дапамагаць студэнтам наладзіць добры адпачынак, друк заклікан адлюстроўваць жыццё і быт студэнтаў, змагацца за чысціню і парадак у пакоях.

Як-жа спраўляюцца насценныя газеты нашых інтэрнатаў са сваімі задачамі?

...Прайшлі перавыбары студэнцкага совета у інтэрнаце па вуліцы Свердлова. У склад новага студсовета увайшлі лепшыя студэнты: Александровіч (хімфак), Позняк (хімфак), Попель (біяфак), Міхалап (гістфак) і іншыя. Старшынёй яго абран студэнт IV курса хімічнага факультэта Іван Александровіч. Новы склад студсовета пачаў працаваць больш энергічна, у якасці свайго дапаможніка, трыбуны крытыкі студсовет выкарыстоувае насценную газету інтэрната «Наш быт».

Нядауна быу праведзен рэнд студсовета і рэдкалегіі газеты «Наш быт». Выявілася, што у пакоях 74 і 94, дзе жывуць студэнты біяфака і геафака, непарадак. Пакой быу сфатаграфаван і здымак змешчан у газеце. Пасля таго, як у газеце была надрукавана другая крытычная заметка—аб жыхарах пакояу 55 і 95, парадак там быу наладжан.

У гэтым навучальным годзе рэдкалегія «Нашага быту» актывізавала сваю работу. Але тут ёсць і недахопы. Так, у першым нумары газеты палова месца была занята агульным перадавым артыкулам. Лепш было-б даць некалькі маленькіх, канкрэтных матэрыялау, пісем чытачоу, фотаздымкау, карыкатур.

...Заглянем у інтэрнат па вуліцы Кірава. Тут таксама выходзіць насценная газета. У мінулым навучальным годзе рэдкалегія яе працавала дрэнна. За увесь год было выпушчана усяго 4 нумары. Хаця газета і выступала па некаторых злобадзённых пытаннях, але яе голас быу чуцен вельмі рэдка. Газета выходзіла не рэгулярна і, як правіла, прысвячалася святочным датам: 7 Кастрычніка, 1 студзеня, 1 Мая і 8 красавіка.

Нядауна рэдактарам насценнай газеты назначан студэнт I курса аддзялення журналістыкі Э. Кандзерскі. Рэдкалегія новага складу робіць першыя крокі—ужо выпушчан адзін нумар. Чытаючы газету, можна пазнаць, што у інтэрнаце ёсць нямала пакояу, дзе заусёды панує чысціня і парадак. Так, жыхары 38-га атрымалі права карыстацца грамадскай радыёлай. Але разам з тым газета адзначае, што яшчэ не рэдкія выпадкі парушэння правіл агульнажыцця. Студэнты 5 курса юрфака Лысенка, Андрэенка і нават сам стараста пакоя Матора да позняй ночы гуляюць у карты. Насценная газета крытыкуе і такіх парушальнікаў парадку, як студэнтка гістарычнага факультэта Андрэйчык, п'яніца і дэбашыр студэнт Марчэнкау.

...А вось інтэрнат на вуліцы Бабруйскай. Якая-ж тут газета? «Ніякай»,—адкажа кожны жыхар гэтага інтэрната. За апошнія тры месяцы тут не выпушчан ні адзін нумар і ніхто не ведае, ці выйдзе ён калі-небудзь. Не ведаюць гэтага і студэнцкі совет інтэрната, і уноу абраная рэдкалегія газеты. Старшыня студсовета Н. Плашчынская толькі абяцае, што сёння-заутра павінен выйсці нумар газеты. Час ідзе, становішча-ж не мяняецца.

Набліжаецца экзаменацыйная сесія. У гэтым адказным маманце у жыцці студэнтау насценныя газеты адыгралі-б вялікую ролю. На жаль, яшчэ ні адна насценная газета інтэрнатау не выступіла па гэтаму пытанню, не прысвяціла яму ніводнага радка.

Як ні крыудна, але трэба адзначыць, што партыйныя бюро факультэтау мала цікавяцца бытам студэнтау, работай рэдкалегій інтэрнацкіх насценных газет, не удзяляюць ніякай уваги гэтаму пытанню. Нават на перавыбарчым сходзе студсовета не было ні аднаго прадстаўніка партыйных бюро факультэтау: хімічнага, біялагічнага, гістарычнага і іншых. Не бываюць у інтэрнаце і выхавацелі груп. У новым навучальным годзе інтэрнат наведалі толькі дэкан геафака О. Н. Андрушчанка і выхавацель групы 5 курса гэтага-ж факультэта І. І. Трухан.

Некаторыя партбюро ставілі пытанне аб інтэрнатах у агульнай справе ідэалагічнага выхавання студэнтау, але рашучых дзеянняу, сапраўднай дапамогі не аказалі. Пакуль што справа ідзе самацёкам. А час удзяліць увагу гэтай важнай справе прыйшоу дауно.

Не цікавяцца выпускам насценных газет у інтэрнатах і комсамольскія бюро факультэтау. Можа яны лічаць, што гэта не іх прамы абавязак?

Партыйныя і комсамольскія бюро факультэтау неадкладна павінны заняцца студэнцкімі інтэрнатамі, дапамагчы рэдкалегіям зрабіць насценныя газеты трыбунай крытыкі, барацьбітамі за чысціню і парадак у сваіх інтэрнатах, прапагандаваць лепшыя пакоі, расказваць аб тым, як студэнты рыхтуюцца да экзаменацыйнай сесіі, змагацца за культурнае афармленне кожнага нумару.

В. КАВАЛЬКОЎ,
Е. ПРАКОП'ЕЎ,
А. ФУРЫК.

ЗА ВЫСОКУЮ АКТЫЎНАСЦЬ КОМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

Штогод ва усе куткі рэспублікі, а часта і далека за яе межы, раз'язджаюцца сотні маладых спецыялістаў з дыпломамі Беларускага універсітэта. Як праявяць сябе яны на новым месцы, як сумеюць выкарыстаць веды, атрыманыя за гады вучобы ва універсітэце, на практычнай рабоце, якімі поглядамі, звычкамі, норавамі будуць вызначацца ва ўзаемаадносінах з людзьмі, наколькі справяцца са сваей роллю спецыяліста—удзельніка грамадскай работы—усё гэта у канчатковым выніку з'яўляецца пазачыкам работы прафесарска-выкладчыцкага складу і грамадскіх арганізацый універсітэта.

Часта прыходзіцца слухаць добрыя, радуючыя сэрца водгукі аб выпускніках БДУ, працуючых у розных галінах народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі. Аднак нярэдка з горыччу і абурэннем пазнаеш аб ганебных учынках і непрыгожых справах нашых выпускнікоу.

У мінулым годзе ў камітэт комсамола прышло пісьмо, у якім гаварылася, што выпускніца аддзялення фізікі Ідчак не пажадала удзельнічаць у грамадскай рабоце, пагардліва аднеслася да калектыву той школы, якая яе выхавала і ў якой ёй даверылі пасля заканчэння універсітэта выхоўваць вучняу. Нядауна на комсамольскай канферэнцыі расказалі аб абывацельскіх, мяшчанскіх поглядах выпускніцы універсітэта мінулага года Ларычкавай. Абедзве гэтыя дзяучыны паехалі з універсітэта не толькі з дыпломамі, але і з комсамольскімі білетамі ў кішэнях. Гэтыя факты гавораць аб сур'ёзных недахопах у рабоце комсамольскай арганізацыі. Гэта-ж не сакрэт, што камітэт комсамола, факультэцкія бюро і многія комсамольцы-актывісты курсаў і груп не заусёды адчуваюць адказнасць за выхаванне кожнага чалавека, закончыушага універсітэт. Захапляючыся агульнымі мерапрыемствамі, курасавыя і факультэцкія комсамольскія бюро часта забываюць аб менш прыкметнай, але больш важнай, індывідуальнай рабоце са студэнтамі, не задумваюцца над тым, дзе студэнт бывае у вольны ад заняткаў час, чым ён займаецца, якое яго акружэнне, як ён падрыхтаваны да жыцця, да самастоінай працы, да таго, каб

ВЫСТАЎКА аб жыцці і дзейнасці В. І. ЛЕНІНА

Кабінет гісторыі КПСС арганізавау выстаўку «Жыццё і дзейнасць В. І. Леніна».

Выстаўка складаецца з 21 раздзела. Асабліва шырока прадстаўлены раздзелы: «Ленінскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа»—пачатак рэвалюцыйнай партыі», «Гады першай рэвалюцыі», «У дні Вялікага Кастрычніка», «Перыяд замежнай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны». Аб згуртаванасці вакол Комуністычнай партыі, аб барацьбе савецкага народа за ленінскія ідэі расказвае апошні раздзел выстаўкі «Усюды, заўсёды непадзельна з намі Ленін».

На выстаўцы прадстаўлен багаты і каштоўны матэрыял з жыцця і дзейнасці В. І. Леніна, з гісторыі рэвалюцыйнага руху у Расіі. Тут і кнігі, па якіх вучыуся Ленін у юнацкія гады, і здымкі тых, хто працавау з ім у першых марксісцкіх гуртках. Акрамя рэдкіх фотаздымкаў, на выстаўцы змешчаны малюнкі, рэпрадукцыі савецкіх мастакоў, у якіх раскрываецца вобраз вялікага правадыра, яго жыццё і дзейнасць. На выстаўцы шырока прадстаўлены творы В. І. Леніна у іх храналагічным парадку, гістарычныя дакументы аб падрыхтоўцы трох рускіх рэвалюцый, дэкрэты першых год Савецкай улады.

Выстаўка «Жыццё і дзейнасць В. І. Леніна» з'яўляецца каштоўным дапаможнікам у вывучэнні многіх грамадскіх навук.

І. НІКАЛАЕЎ.

Пасля смеху часта плачуць

«Ноч начаваць—не век векаваць»,—гаворыць руская прымаўка. Аднак студэнт III курса філфака Г. Праваловіч не згодзен з гэтай ісцінай. Выкінуўшы частку «не», ён ціха, мірна спіць. Спіць днём, спіць ноччу. Дарэчы, «ноч»—панятце даволі няпэўнае. Верхні рубеж ночы наогул нявызначаны. Нават у дванаццаць гадзін дня можна застаць Праваловіча у ложку. А раніцой...

Сем гадзін пяцьдзесят мінут. З неймавернай шпаркасцю ускочыўшы з ложка, абы-як заправіўшы яго, а часцей за усё не заправіўшы, ледзь апаласнуўшы палову твару, а часцей зусім не памыўшыся, ён з хуткасцю, уласцівай майстру спорту, праходзіць поўкіламетровую дыстанцыю ад корпуса «А» да Чырвонаармейскай вуліцы.

Восем гадзін. Натоўп, чарга, сумяціца у вестыбюлі філфака праглынула Праваловіча. Успамінаецца старадаўні анекдот аб унечарговай стыпендыі.

Восем гадзін дзесяць мінут. Раздаецца паспешны стук, у дзверы аудыторыі усоўваецца сонны твар Праваловіча, і выкладчык вымушан перарваць лекцыю. У журнале старасты паяўляецца «о». Але часцей супроць прозвішча Праваловіча ставіцца «нб». А колькі такіх Праваловічаў і «нб» пястрыць у журналах філфака, юрфака і другіх факультэтаў!

Нават першакурснікі, бадай, самыя старанныя студэнты, пачалі парушаць традыцыі: радзеюць рады прыхільнікаў дысцыпліны. Першакурснік гістфака Літвін прапусціў некалькі дзесяткаў гадзін занятках. Таварышы-комсамольцы выклікалі яго на комсамольскі сход, хоць ён і не комсамолец, і прышлося Літвіну перажыць некалькі непрыемных мінут.

На II курсе юрфака комсамолец Капленка надта часта адпачывае ад лекцый. У мінулым годзе вынікам гэтага з'явілася акадэмічная запазычанасць па усеагульнай гісторыі дзяржавы і права. Але, відаць, ніякага уражання гэта на яго не мела. Комсамольцы, рашыўшы пагутарыць з Капленка, працавалі яму з'явіцца на бюро. Капленка не прыйшоў. І комсамольцы спыніліся на поўдарозе, не давялі да канца пачатую справу. А іх таварыш усё далей адстае ад курса.

Класічны узор недысцыплінаванасці прадэманстравау пяты курс філфака. На лекцыю па матэрыялах юбілейнай сесіі Вярхоўнага Совета Союза ССР з'явілася 10 працэнтаў студэнтаў: «усеведаючыя» пяцікурснікі паказалі перш за усё пагардлівыя адносіны да вывучэння грамадскіх навук.

Як сямігадовае дзіця, вядзе сябе на занятках студэнт I курса філфака В. Салееў, перашкаджае займацца непамерна гаварлівая Ганчарова (II курс юрфака). Не дзейнічаюць на іх і заўвагі таварышоў.

Многа можна гутарыць аб спазненнях, дрэнных паводзінах. Спяць студэнты. Спяць комсамольскія арганізацыі факультэтаў. Спяць. Не чуюць! Прачнуцца — глядзіш—позна будзе!

Е. ЛЯХАЎ.

На здымку: Члены рэдкалегіі бюлетэня СНТ С. Шуміліна (3 курс), Т. Банкецік, Л. Ільіна, Г. Галкоўская (4 курс) за выпускам чарговага нумару бюлетэня СНТ.

ПОЛЬСКІ прафесар у нашым універсітэце

Па запрашэнню Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР наш універсітэт наведау дэкан юрыдычнага факультэта Варшаўскага універсітэта прафесар Леў Станіслававіч Куроўскі. Ён прачытаў студэнтам-юрыстам лекцыю па фінансаваму праву, а таксама выступіў з дакладам аб пастаноўцы юрыдычнай адукацыі у Варшаўскім універсітэце, у якой расказаў:

— Да 1956 года усе адміністрацыйныя пасады назначаліся урадам. Зараз яны выбарныя. Дэканаў і прадэканаў выбірае тайным галасаваннем Вучоны совет факультэтаў, у які уваходзяць прафесары, дацэнты, намеснікі прафесараў. Рэктар і прарэктары выбіраюцца сенатам (Вучоным советам) універсітэта таксама тайным галасаваннем.

Усе паступаючыя здаюць вусны і пісьмовы экзамен. Патрабаванні на экзамене вялікія. У гэтым годзе па плану мы маглі прыняць 150 чалавек. Здавалі экзамен 500, з якіх вытрымалі яго 300 чалавек. Аднак восенню мы прынялі яшчэ дадаткова 100 чалавек з ліку не прайшоўшых па конкурсу. Такім чынам, на першы курс юрфака было залічана 250 чалавек.

У нас яшчэ, у не зусім адноўленай Варшаве, не вырашана праблема забеспячэння інтэрнатамі. Для 150 спачатку прынятых студэнтаў мы мелі толькі 30 месц у інтэрнаце. Астатнія жывуць у сваякоў, знаёмых, а то і наймаюць кватэру. Дзве трэціх нашых студэнтаў атрымліваюць стыпендыю.

На першым курсе студэнт атрымлівае 260 злотых у месяц. З пераходам студэнтаў на старэйшыя курсы размер стыпендыі павялічваецца да 500 злотых. Ёсць таксама і прэміяльныя стыпендыі. Яны на сто злотых больш звычайных. Атрымліваюць стыпендыі студэнты, якія добра вучацца і матэрыяльна не забяспечаны. Маюцца студэнцкія сталовыя з таннымі цэнамі.

Навучанне у нас бясплатнае. Наведванне лекцый—не абавязковае. Абавязковым для усіх студэнтаў з'яўляецца наведванне семінараў і практычных заняткаў. Выкладчыкі часта выклікаюць студэнтаў да сябе на кансультацыі, каб кантраляваць іх самастойную працу. Канчаткова веды студэнта правяраюцца на экзаменах. Усе 4—5 экзаменаў студэнт здае ў адзін дзень. Калі студэнт не працаваў на працягу года, то ён не зможа падрыхтавацца у адзін дзень. Гэтая сістэма апраўдвае сябе. Калі студэнт атрымоўвае нездавальняючую адзнаку на экзамене, яму прадстаўляецца магчымасць пераздаць яго. Веданне студэнтамі лацінскай і адной з чатырох моў па выбару: рускай, французскай, англійскай або нямецкай з'яўляецца абавязковым.

З 4-га курса пачынаецца падрыхтоўка да напісання дыпломнай работы. У гэтым вялікую дапамогу студэнтам аказваюць выкладчыкі. Студэнту дазваляецца прадстаўляць да абароны дыпломную работу на працягу года пасля заканчэння універсітэта. У гэтым выпадку студэнту да абароны выдаецца пасведчанне, а не дыплом.

Студэнт праходзіць практыку тры разы па чатыры тыдні. Першая практыка пачынаецца пасля заканчэння трэцяга курса у крымінальным судзе і пракуратуры. Другая практыка — пасля заканчэння першага семестра на І-ым курсе—у адміністрацыйным дзяржаўным апараце, а пасля заканчэння 4-га курса—у грамадзянскім судзе або арбітражнай камісіі.

Да 1956 года мы непасрэдна накіроўвалі на работу сваіх выпускнікоў. Зараз кожны выпускнік выбірае сам месца работы. Ва універсітэце ёсць спецыяльная камісія, якая дапамагае выпускнікам уладкоўвацца на работу.

Па прыезду на Радзіму я буду садзейнічаць таму, каб вашы выдатнікі вучобы пабывалі у нас, а нашы—у вас. Асабіста я вельмі удзячны, што запрашэннем у ваш універсітэт мне аказан вялікі гонар. Я вельмі многа карыснага бачыў на юрыдычным факультэце Беларускага універсітэта, якое я буду старацца укараніць на факультэце, дэканам якога я з'яўляюся.

І. СТАРАВОЙТАЎ.

пасля заканчэння ВНУ стаць актыўным будаўніком комунізма. Вядомы-ж факты, калі выдатнікі, актывісты ва універсітэце аказваюцца сябелюбцамі і ганарыстымі людзьмі у жыцці, і наадварот, нічым не прыкметны на курсе студэнт, якога адносілі нават да разраду «пасіўных» і «шэранькіх», у час работы на цаліне часам становіцца душой вялікага і складанага працоўнага калектыву. Гэта гаворыць аб тым, што мы яшчэ дрэнна умеем працаваць з людзьмі, не ведаем іх па-сапраўднаму, хаця і сустракаемся з імі кожны дзень, вучымся ў адной групе, жывем у адным інтэрнаце. Бачыць і ведаць кожнага чалавека і тых, хто адносіцца да вучобы з душою, і тых, каго яшчэ у многім трэба папраўляць—вось у гэтым і заключаецца адна з асноўных задач комсамольскага актывіста. Тут добрыя усе сродкі: і гутаркі «па душах», і суровая размова на комсамольскім сходзе, і заметка у насценным друку.

Часам комсамольцы курса роўнадушна пазіраюць, як на працягу ўсяго навучання ва універсітэце студэнт парушае вучэбную дысцыпліну, не праяўляе ніякага інтарэсу да сваёй будучай спецыяльнасці, абыякавы да грамадскага жыцця. Яны толькі угаварваюць такога гультая, просяць за яго дэканат, калі ён не спраўляецца з вучэбным планам, выпрашваюць для яго ільготы, каб дазволіць яму некалькі раз здаваць экзамены, выходзячы з ілжывага разумення таварыства, не жадаюць псаваць адносіны з тымі, хто ганьбіць наш калектыў. Комсамольцы не задумваюцца над тым, што іменна такое становішча беспрынцыповасці і згодніцтва параждае такіх людзей, як Ларычкава, Ідчак, вядзе да грубага парушэння Статута комсамола, да амаральных учынкаў, як гэта здарылася з Пятроўскім (хімфак), Безбардам, Станютай (філфак). Додзь (фізмат) і інш.

Цяжкай гірай на нагах комсамольскай арганізацыі з'яўляецца распаўсюджаны сярод часткі студэнтаў універсітэта настрой утрыманства. Нярэдка сустракаюцца у нас студэнты, якія разважаюць прыкладна так: «Паколькі мяне прынялі ва універсітэт, будзьце ласкавы, прадстаўце мне месца у інтэрнаце, стыпендыю, кнігі, падручнікі, стварыце мне умовы для культурнага адпачынку, арганізоўвайце часцей вечары і г. д.», а самі пры гэтым сядзяць, залажыўшы рукі, лічачы уніжальнай для сябе «чорную работу». Такія студэнты забываюць, што інтэрнаты і стыпендыі яны атрымліваюць за лік напружанай працы нашых рабочых і калгаснікаў, забываюць, што не можа быць права без адпаведнага абавязку.

Нам патрэбна, каб комсамольская арганізацыя вырашала больш канкрэтных, жывых, патрэбных усёй краіне спраў, каб комсамольцы універсітэта не замыкаліся у сваім студэнцкім асяроддзі, а актыўна удзельнічалі у рабоце на цалінных землях, у шэфскай і агітацыйнай рабоце на заводах, будаўніцтве, у рабочых інтэрнатах, калгасах, умацоўвалі сяброўскія сувязі з комсамольскімі арганізацыямі часцей Савецкай Арміі і Флоту, працавалі з дзецьмі ў піонерскіх атрадах. Удзел у такіх справах дапаможа будучаму спецыялісту лепш пазнаць жыццё, загартаваць свой характар, выкрышталізаваць свае погляды.

Важнейшую ролю у выхаваўчай рабоце адыгрывае удзел студэнтаў у грамадска-карыснай працы. Дэвізам для нас павінны стаць словы В. І. Леніна: «Толькі у працы сумесна з рабочымі і сялянамі можна стаць сапраўдным комуністам». У гэтым годзе звыш 500 студэнтаў універсітэта збіралі ураджай на цалінных землях Казахстана, каля 1200 студэнтаў прынялі удзел у сельскагаспадарчых работах у калгасах Мінскага раёна. Нядаўна комсамольцы I курса аддзялення матэматыкі звярнуліся з заклікам да усіх студэнтаў універсітэта прыняць удзел у жыллёвым будаўніцтве горада. Зараз прадстаяць вялікія работы па будаўніцтву галоўнага вучэбнага корпуса універсітэта аб'ёмам 80 тыс. $м^3$ і студэнцкага інтэрната на 800 месц. Абавязак кожнага комсамольца, кожнага студэнта—прыняць асабісты уддзел у будаўніцтве гэтых аб'ектаў, садзейнічаць іх хутчэйшаму увядзенню у эксплуатацыю. У бліжэйшы час камітэт комсамола прыступіць да стварэння студэнцкіх брыгад, якія будуць у паслявучэбны час абучацца прафесіям плотнікаў, штукатураў, маляроў а з канца сакавіка месяца 1958 года гэтыя брыгады прыступяць да работы на будаўніцтве вучэбнага корпуса і інтэрната.

Часта прыходзіцца чуць пытанне: як нам павысіць актыўнасць комсамольцаў? Ёсць толькі адзін шлях у гэтым напрамку: уважлівыя адносіны да усіх крытычных заўваг і прапаноў, выказваемых комсамольцамі, абавязковая інфармацыя аб зробленай рабоце.

На усіх факультэтах і курсах прайшлі справаздачна-выбарчыя сходы. На многіх з іх комсамольцы гаварылі аб тым, як палепшыць работу арганізацыі, унеслі дзелавыя, цікавыя прапановы. Прайшло ўжо дастаткова часу, а зроблена пакуль яшчэ вельмі мала у справе рэалізацыі гэтых прапаноў. Забываючы аб іх, мы тым самым глушым актыўнасць комсамольцаў, абядняем работу нашай арганізацыі.

У 1958 годзе у жыцці комсамола адбудуцца важныя падзеі—у красавіку адбудзецца XIII з'езд ВЛКСМ, а ў кастрычніку будзе адзначацца 40-годдзе комсамола, крыху пазней—40-годдзе БССР. Рыхтуючыся да іх, мы павінны арганізаваць сустрэчы са старымі комуністамі, якія працавалі у комсамольскіх арганізацыях 20—30-х гадоў, напісаць комсамольскі летапіс універсітэта. Але галоўным нашым падарункам да з'езду і 40-годдзя комсамола і БССР з'явіцца добрая і выдатная вучоба. Камітэт комсамола, комсамольскія арганізацыі факультэтаў, курсаў і груп павінны прыняць усе намаганні для таго, каб павысіць узровень падрыхтоўкі студэнтаў да экзаменацыйнай сесіі, каб прадстаячая зімняя і летняя экзаменацыйныя сесіі прайшлі з высокімі паказчыкамі

Я. БАБОСАЎ,
сакратар камітэта комсамола.

Без узаемнасці

Добрая, вельмі добрая задума узнікла у студэнтаў II курса аддзялення фізікі—правесці вечар адпачынку сумесна з рабочымі радыёзавода. Але добрая думка павінна увасабляцца у жыццё стараннай падрыхтоўкай. Апошняга якраз было менш за усё. Запрашэнне на вечар да студэнтаў рабочыя атрымалі усяго за некалькі гадзін да пачатку яго.

Было на ім усё, што бывае і на другіх сумных вечарах. Загадзя да прыезду рабочых у зале і на калідоры хрыпела радыёла. Ніхто гасцей не сустракаў, прыйшлі яны ціханька, сталі у куточку, а потым сталі рабіць тое, што рабілі усе студэнты—танцаваць. Была паказана на вечары самадзейнасць курса. Не было толькі шчырых сяброўскіх выступленняў. Студэнты сабе, рабочыя—сабе.

Цікава, для чаго тады было запрашаць рабочых, калі і тыя і другія рассталіся, па-сапраўднаму нават не пазнаёміўшыся?

С. ІВАНОЎ.

4 № 29(307) БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ 13 снежня 1957 г.

СПАРТЫЎНАЯ СТАРОНКА

Упершыню ва універсітэце

1 снежня праводзіліся спаборніцтвы на першынство універсітэта па цяжкай атлетыцы, у якіх удзельнічала 18 чалавек.

У спаборніцтвах быў паказан рад добрых вынікаў. Студэнт 5-га курса фізмата Гусеў і студэнт геафака Жукаборскі выканалі нарматывы другога разраду. Нядрэнна выступілі нашы маладыя штангісты Сцяпанаў (юрфак), Дрын (фізмат).

Чатыры студэнты выканалі нарматывы трэцяга спартыўнага разраду.

Нягледзячы на тое, што спаборніцтвы былі асабіста-камандныя, барацьба у асноўным праходзіла паміж камандамі фізмата і юрфака. Не зразумела, чаму такія факультэты, як геолага-геаграфічны, хімічны і іншыя, не змаглі выставіць каманд, хаця у секцыі цяжкай атлетыкі займаюцца студэнты з гэтых факультэтаў.

Дрэнную дапамогу у арганізацыі спаборніцтваў аказаў спартыўны клуб БДУ.

В. КАВАЛЁЎ.

На здымку: Студэнт юрфака А. Мызнікаў, чэмпіён універсітэта па цяжкай атлетыцы у поўсярэдняй вазе.

Фота В. ДАШУКА.

На здымку: член секцыі спартыўнай гімнастыкі Елена Шэшмінцава выконвае практыкаванне на бервяне.

Фота Нік. ЧЭХОЎСКАГА.

СУСТРЭЧА ПАВІННА СТАЦЬ ТРАДЫЦЫЙНАЙ

Нядауна прыязджалі баскетбалісты Літоўскага універсітэта, каб памерацца сіламі з баскетбалістамі БДУ.

...Спартыўны зал Акруговага Дома афіцэраў. На пляцоўку выходзяць мужчынскія і жаночыя каманды братніх універсітэтаў. Абмен памятнымі падарункамі....

Да спартсменаў звяртаецца старшыня праулепня спортклуба БДУ М. А. Шэйнеман.

— Мы рады вітаць дарагіх гасцей. Няхай гэтая сустрэча пакладзе пачатак добраму спартыунаму сяброўству.

Першымі пачынаюць гуляць жаночыя каманды. Мяч у гульні. Пачатак складаецца не у карысць нашых спартсменак. На першайжа мінуце Навіцкая дапускае персанальную памылку. Госці рэалізуюць брасок. Лік 1:0. Затым адказная атака і лік стаў 2:1 ужо у карысць гаспадароў поля. Літоўскія баскетбалісткі актывізуюцца і робяць разрыў у некалькі ачкоў. У другой палавіне гульні наша каманда не магла скараціць разрыў. Госці атрымалі заслужаную перамогу з лікам 52:42. Вельмі дрэнна гуляли Навіцкая і Дзідзенкова.

У нашых гасцей асабліва выдзялялася капітан каманды Данута Каралюкайтэ. Мы папрасілі яе высказаць свае уражанні аб гульні.

— Гульня мне вельмі спадабалася,—сказала яна. — Асабліва — вашы «балельшчыкі».

Потым спаборнічалі мужчынскія каманды. Тут нашы баскетбалісты дамінiравалі на полі і перамаглі з лікам 82:63.

Госці засталіся вельмі задаволеныя прыёмам, які быў аказан ім нашымі спартсменамі. Пачатак добрага сяброўства пакладзен!

А. ФЁДАРАЎ.

Адно з першых

БАСКЕТБОЛ

За апошнія гады нашы баскетбалісты паказалі сябе мацнейшымі сярод каманд вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. На І Усебеларускай спартакіядзе студэнтаў як жаночая, так і мужчынская баскетбольныя каманды правялі усе гульні без паражэнняў і легка выйгралі першае месца. Гонар БДУ абаранялі такія спартсмены, як Карашкоў, Жук, Анкуда, Логнік, Свідэрская, Гарохава і інш. Але гэтыя, усім вядомыя спартсмены, заканчвалі вучобу ва універсітэце і пакідалі каманды, а работа з маладымі баскетбалістамі, якія вучацца на першым-другім курсах, вялася дрэнна. Пагэтаму каманды аслабелі.

Так, у 1956 годзе мужчынская каманда заняла толькі трэцяе месца, а жаночая—другое.

Летам-жа гэтага года наша мужчынская каманда змагла заняць толькі 4-ае месца, прайграўшы лесатэхнічнаму інстытуту.

З пачатку гэтага навучальнага года зборныя каманды баскетбалістаў пачалі рэгулярныя трэніроўкі пад кіраўніцтвам вопытнага баскетбаліста-трэнера Барыса Аўдзеевіча Гукава. На кожнай трэніроўцы баскетбалісты каля поўгадзіны праводзяць размінку, выконваючы розныя практыкаванні, якія робяць спартсменаў фізічна падрыхтаванымі да гульні у любых умовах. Потым тэхнічныя практыкаванні з баскетбольным мячом (40 мінут гульні).

Такія трэніроўкі далі свае нядрэнныя вынікі. У першынстве горада Мінска сярод каманд ВНУ мужчынская каманда правяла усе гульні у сваёй падгрупе на высокім узроўні і прайграла толькі камандзе Інстытута фізкультуры.

У барацьбе за 3—4 месца сустрэлася мужчынская баскетбольная каманда БДУ з баскетбалістамі Інстытута народнай гаспадаркі. Гэтая сустрэча адбылася пры вялікай перавазе спартсменаў універсітэта 56:32. Героем гэтай сустрэчы быў малады баскетбаліст член зборнай каманды Беларусі студэнт фізмата Валодзя Крысевіч. Ён прынёс камандзе 22 ачкі.

Мужчынская баскетбольная каманда універсітэта заслужана заваявала 3-яе месца сярод каманд вышэйшых навучальных устаноў Мінска.

Добра правялі сустрэчу нашы баскетбалісткі са спартсменкамі медыцынскага інстытута за 3—4 месцы. Гульня закончылася з лікам 44:27 у карысць студэнтак БДУ.

А. ПУСТАХОД,
студ. аддз. журналістыкі.

выходзіць Гараеу. Ён глядзіць на звернутыя да яго твары суддзяў, спартсменаў, трэнераў. Да яго прыходзіць заспакаенне. Моцным, упругім крокам набраўшы разбег, ён адштурхоўваецца і, яшчэ знаходзячыся у паветры, зауважае, што прызямляецца непадалёку ад флажка. Усе, здзіўленыя, ускакваюць са сваіх месц, але суддзя аб'яўляе: «Не лічыць!»

— Ледзь-ледзь пераступіў брусок,—гаворыць Владзіміру трэнер.—Адняслі на поступні разбег, і усё будзе добра.

Аднак з другой спробы яго вынік аказауся зусім пасрэдным.

— Баішся бруска,—сказау трэнер Владзіміру.—Бяжы смялей, а галоунае—адчувай сябе свабодна.

Владзімір выходзіць на дарожку для апошняга разбегу. Моцным напружаннем волі падавіў стому. Зрабіўшы глыбокі удох і сканцэнтраваўшыся быццам-бы для скачка з абрыву, ён зрываецца з месца. Вось ён набег на брусок, адштурхнууся уверх, быццам мячык праскакау па зямлі і апусціуся ў яму.

Стомлены Владзімір падняуся і падыйшоу да скамейкі.

— 15 метрау 53 сантыметры, — данеслася да яго, і Владзімір уздрыгнуу: гэта-ж лепш нормы майстра спорту.

— Віншую з новым рэкордам Беларусі,—абдымаючы, гаворыць яму таварыш па камандзе экс-рэкардсмен рэспублікі В. Іваноу.

— І яшчэ... віншуем цябе з новым юнацкім рэкордам краіны і з трэцім месцам у сённяшнім спаборніцтве.

Владзімір стрымана усміхаецца, хоць унутры кіпіць вялікая радасць.

...Цяпер Владзімір Гараеу вучыцца на другім курсе. Кожны дзень пасля заняткаў яго можна бачыць ва універсітэцкай спартыунай зале. Владзімір рыхтуецца да новых спаборніцтваў.

А. СІЛЕНКОЎ.

БАРАЦЬБА БЫЛА ВОСТРАЙ

ШАШКІ

Працягваецца турнір шашыстау. У пятым туры каманда фізмата сустрэлася з хімікамі, а асноуны сапернік фізмата—каманда філфака была свабодна у той дзень ад гульняў.

Хімікі не маглі аказаць сур'ёзнага супраціулення чэмпіёну, і сустрэча закончылася з лікам 6½:1½ у карысць фізмата. Такім чынам, гэта каманда закончыла турнір, набраўшы 31 ачко. У каманды філфака была упераддзе яшчэ адна ігра і на 6½ ачкоу менш. Усё вырашалася ў апошнім туры. Калі каманда філолагаў выйграе у гісторыкаў з лікам 7:0, назва чэмпіёна пераходзіць да іх. Але філолагі дапусцілі памылку, пасадзіушы на 4 дошку запаснога Войтка. Ён гуляу вельмі неасцярожна і прайграу партыю. Агульны лік 6:1 у карысць філолагаў. Яны набралі 30½ ачкоу і заняли другое месца, адстаушы ад фізмата усяго на ½ ачка. Трэцяе месца заняла каманда геафака.

Пасля заканчэння спаборніцтваў выступіу майстар спорту СССР па шашках Ракітніцкі. Ён цікава расказау аб развіцці шашачнага спорту у Беларусі, спыніуся на рашэнні эцюдау, задач. Пасля гэтага майстар дау сеанс адначасовай гульні у шашкі на 23 дошках. Лік 18½:4½ у карысць майстра, які 5 партый звёў уничыю і дзве прайграу студэнтам філфака В. Канаплицкаму і І. Курбека.

І. ДОНАЎ.

МАЙСТАР ТРАЙНОГА СКАЧКА

ЛАДЗІМІР трымау ціснёны серабром атэстат сталасці і думаў. Не у першы раз прыходзіцца яму ламаць галаву над тым, што дауно стала ясным для яго таварышоу.

— Чаго час дарэмна цягнеш?— здзіуляліся аднакласнікі.

— Ты-ж спартсмен, першаразраднік. Твой прамы шлях—у Інстытут фізкультуры. Ці ты разлюбіу спорт?

Не, спорт ён ніколі не разлюбіць. Ён нават не можа уявіць сябе без спорту. Владзімір з вялікім азартам аддаваўся у дзяцінстве усякім гульням, з якой зайздросцю глядзеу на стадыёне на загарэлых, моцных і мускулістых людзей, а потым і сам захапіўся спортам. Памятае Владзімір, як прыйшоу першы спартыуны поспех. На першынстве Беларусі сярод школьнікаў, якое праходзіла летам 1955 года, Владзімір Гараеу, нікому не вядомы спартсмен, устанавіу новы юнацкі рэкорд Беларусі па трайному скачку. У тыммжа годзе ён паехау у Маскву на Усесаюзную школьную спартакіяду і заняу там першае месца.

Памятае Валодзя і тое, як школьны настаунік хіміі сказау яму: «Выдатна ставіу я табе па свайму прадмету не дарма. Твае веды па хіміі мяне заусёды здзіўлялі і радавалі. Будзе вельмі дрэнна, калі ты закінеш гэтую цікавую навуку».

Стары настаунік быццам-бы чытау думкі свайго вучня. Владзімір і сам зразумеу, што хімія дауно перастала быць для яго проста школьнай дысцыплінай. Ён больш другіх заседжваўся у школьнай хімічнай лабараторыі, дома у вольны час зачытваўся кнігамі аб цікавых ператварэннях у прыродзе, аб захапляючых хімічных рэакцыях.

Владзімір падае дакументы на хімічны факультэт Беларускага універсітэта.

...Летам 1956 года Владзімір трэніраваўся ужо сумесна з лёгкаатлетамі БДУ. Падрыхтоука да экзаменау і траума нагі адмоуна сказаліся на яго спартыуных выніках. Але ён не сумаваў. Дружны калектыу спартсменаў універсітэта і вопытны трэнер дапамаглі яму хутчэй увайсці у добрую спартыную форму. Выступаючы на Усесаюзных спаборніцтвах сярод школьнікаў, ён ізноу займае першае месца па скачках у даужыню і па трайному скачку.

Спорт ніколі не засланяў у Владзіміра вучобу. З хваляваннем рыхтаваўся ён да сваёй першай экзаменацыйнай сесіі і потым з вялікай радасцю паказваў таварышам першую адзнаку у заліковаі кніжцы—«выдатна».

Пасля летняй экзаменацыйнай сесіі для Владзіміра наступіла напружанае і гарачае спартыунае лета. Як член зборнай каманды Беларусі ён удзельнічае у розных спаборніцтвах на стадыёнах Масквы, Ленінграда, Вільнюса. Але асабліва памятным застауся для яго горад Харкаў, дзе адбылося першынство Цэнтральнага Саюза таварыства «Дынамо».

...На гарэвай дарожцы у лёгкім бегу размінаюцца удзельнікі Алімпійскіх гульняу Канстанцін Цыганкоу, Вітольд Крэер, і заняушыя у Мельбурне ІІІ месца майстры спорту Іваноу, Гаурылау і інш. Сярод іх Владзімір Гараеу адчуваў сябе не зусім упэунена, крыху хвалявауся. Яму прадстаяла барацьба з моцнымі праціунікамі.

Заканчваецца размінка. Спартсмены збіраюцца у сектары для скачкоу. Суддзі выклікаюць В. Крэера. Усе з зайздрасцю наглядаюць, як лёгка і прыгожа выконвае скачок алімпійскі прызёр. Яго вынік—16 метрау. Далей наурад ці зможа хто скокнуць, на гэтай адлегласці устанауліваюць жоўты флажок. На дарожку для разбегу

Рэдактар А. ВОЛК.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус. 72, тэл. 2-07-19.

АТ 01705 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 1297 Тыраж 2000